Такая ж арыфметыка атрымліваецца і па іншых накірунках. Замест спакойнага, цвярозага аналізу спраў, у нас часта выдаецца пажаданае за сапраўднае. Такая практыка нічога, акрамя шкоды, не прыносіць. Да падобнай думкі прывodзяць факты, з якімі наш карэспандэнт сутыкнуўся на мінскім маторным заводзе. Гэта прадпрыемства павялічыла сёлета выпуск матораў на 20%. Але што яно займела? Ды нічога добрага. Бо адправіла многія маторы ў Кішынёў у абмен на памідоры і арбузы. У гэтай аперацыі, вядома ж, выйграў малдаўскі бок. Ён набыў сучасныя маторы, якія будуць працаваць многія гады і прыносіць даход, а мінчане з'елі тыя памідоры і зноў засталіся без грошай, не змаглі нічога прыдбаць з сучаснай тэхналогіі. Каму патрэбен такі гандаль?..

А ім жа займаецца не адзін маторны завод, а многія прадпрыемствы, калі не большасць. Аб гэтым сведчаць даныя статыстыкі аб знешнім гандлі. Павялічваюць і павялічваюць выпуск прадукцыі нашыя заводы, а валюты чамусьці становіцца ўсё меней і меней, усё расце і расце адмоўнае сальда. Калі пасля першага квартала яно складала 624,4 мільёна долараў, пасля мая — 815 мільёнаў, дык у студзені — ліпені — ужо 1079,6 мільёна долараў. Як бачым, пераваліла за мільярд. Гэта значыць, што мы купляем за мяжой болей, чым прадаём туды. Калі так справы пойдуць і далей, дык хутка не будзе за што купляць за мяжой самае неабходнае.

Калі твае тавары ўсё меней і меней купляюць, а сам вымушаны набываць неабходнае ў суседзяў, бо не здольны зрабіць яго сам — дык які ж ты гаспадар? Вось якія думкі выклікаюць вынікі нашага гаспадарання, калі аналізуеш іх цвяроза і аб'ектыўна.

Нам рана біць у барабан. Замест гэтага патрэбны ўдумлівы аналіз зробленага і пошук эфектыўных шляхоў па вываду эканомікі з крызісу.

Алесь ДРАБЧУК.

Без грыфа "Сакрэтна"

Якія ўклады насельніцтва ў банках?

Па стану на 1 верасня гэтага года ўклады насельніцтва ў камерцыйных банках склалі 10,3 трыльёна рублёў. Многа гэта ці мала? А вось мяркуйце. Запазычанасць па зарплаце ў краіне па стану на 25 жніўня была 518,1 мільярда рублёў, альбо 7,9% ад усяго фонда зарплаты за ліпень. Простыя разлікі паказваюць, што ліпеньскі фонд зарплаты прыкладна 6,56 трыльёна рублёў. Адсюль вынікае, што калі б насельніцтва раптам зняла ўсе грошы, дык яно магло б ледзь-ледзь пракарміцца каля двух месяцаў. На такія грошы можна купіць 1471 грузавік "БелАЗ". Небагата!

Але для беднай казны і такая сума не малая. Па даных статыстыкі, у студзені — жніўні ў бюджэт дзяржавы паступіла 63,48 трыльёна рублёў. За гэты час падатак на прыбытак і даходы прынёс у казну 4,4 трыльёна рублёў, падаходны падатак з фізічных асоб — 3 трыльёны. Так што сваімі мізэрнымі ўкладамі грамадзяне значна сілкуюць бедную грашовую сістэму. Сумна!

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Крымінал

Падробліваюць ужо і ізраільскую валюту

Падробленыя грошы, хаджэнне якіх апошнім часам набыло ў нашай краіне форму эпідэміі, канфіскуюцца міліцыяй амаль штодзённа.

Так ў Мінску, Магілёве, Браславе, Кобрыне, Крупках, Салігорску былі выяўлены падробленыя купюры — адна 10-доларавая і сем 100-доларавых фальшывак. Але зусім нечаканай стала новая з'ява ў фальшываманетным абароце — банкнота ў 100 ізраільскіх шэкеляў.

Стоп-кадр

Вот такой полуторакилограммовый огурец вырос на даче у родителей шестилетнего Алеся Сорочинского из Могилева.

Фото Николая ТИТОВА, БелТА.

"Арсенал" супраць надомных арсеналаў

Усё новыя вынікі прыносіць бестэрміновая аперацыя органаў унутраных спраў "Арсенал". Як вядома, яна ставіць сабе на мэце выяўленне і канфіскацыю з незаконнага абароту зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў.

Актыўна ўдзельнічаюць у гэтай аперацыі і супрацоўнікі Камітэта па арганізаванай злачыннасці і карупцыі пры МУС, яго падраздзяленняў на месцах. У Мінску 24 верасня яны "выйшлі" на кватэру 56-гадовай пенсіянеркі, якая пражывае па вуліцы Максіма Багдановіча. Паводле існаваўшых даных, там захоўвалася зброя. У пакоі, які ў гаспадыні кватэры найбольш раней судзімы мінчанін, які нідзе не працуе, былі знойдзены і канфіскаваны 570 патронаў калібра 5,6 мм, 16 патронаў да пісталета Макарава, два самаробныя глушыцелі, магазін ад аўтамата Калашнікава, самаробны малакаліберны пісталет, прыцэл начнога бачання.

Уладальніка арсенала застаць знянацку не ўдалося, ён здолеў ўцячы. Але, як лічаць аператыўнікі, быць ва ўцёках таму давядзецца нядоўга.

Адначасова працягваюцца і іншыя аператыўна-пошукавыя мерапрыемствы па лініі барацьбы з арганізаванай злачыннасцю. Як сказаў у гутарцы з карэспандэнтам БелТА начальнік управлення камітэта па Мінску Мікалай Кудзелка, яго супрацоўнікі сёлета значна актывізавалі сваю дзейнасць. Напрыклад, зброі знойдзена і канфіскавана ў злачынцаў значна больш, чым летась. Аднак гэта не азначае, што ў сталіцы намнога вырасла колькасць падпольных арсеналаў. Проста ўзраслі аператыўныя магчымасці міліцыі, у тым ліку і ў правядзенні аперацыі "Арсенал". Актывізацыі работы па прадухіленню крыміналу садзейнічала і ўдасканаленне заканадаўчай базы, унясенне змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы, прынятае спецыяльнага закона па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй.

Сяргей ЦІВАНАЎ.

Фестывалі

Цыганскія рытмы ў беларускай сталіцы

Першы міжнародны фестываль цыганскай песні і танца "Гіля рамэн" адбудзецца ў Мінску 28 верасня ў памяшканні Дома афіцэраў.

Ён праводзіцца ў рамках другога Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур па ініцыятыве нядаўна створанага ў Мінску тэатра "Гіля рамэн". Фестываль арганізаваны Беларускім саюзам кампазітараў пры падтрымцы Міністэрства культуры, Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі і міжнароднай асацыяцыі "Культура — свету".

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў саюзе кампазітараў, у гэтым саюзе цыганскай культуры прымуць удзел калектывы і выканаўцы са Швецыі, Румыніі, Польшчы, Беларусі, Украіны, Казахстана і Расіі. Гасцямі фестывалю будуць маскоўскі тэатр "Рамэн" пад кіраўніцтвам Мікалая Слічэнкі, а таксама зорка беларускай аперэты Наталля Гайда, Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі і ансамбль "Чараўніцы".

Эдуард ПІВАВАР.

Духоўны скарб

Аднаўленне крыжа Еўфрасінні Полацкай стала сімвалам духоўнага адраджэння нацыі

Заканчэнню работ па стварэнню крыжа Прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай, прысвяціў сваё пасяджэнне спецыяльны вучоны савет. Яно адбылося 24 верасня ў будынку Беларускай Экзархіі пры ўдзеле прадстаўнікоў Беларускай Праваслаўнай Царквы, аб'яднання беларусаў свету "Бацькаўшчына", навуковай і творчай грамадскасці.

— Сімвалічна, што адраджэнне святыні — еўфрасіннеўскага крыжа, зробленага ў 1161-ым і страчанага ў 1941 годзе, супала па часе з перыядам набыцця Беларуссю незалежнасці і станаўлення дзяржаўнасці ў нашай краіне, — сказаў на прэс-канферэнцыі, праведзенай пасля завяршэння пасяджэння вучонага савета, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыярхаўскі Экзарх усяе Беларусі. — Цяпер далейшы шлях народа будзе звязаны з гэтай святыняй, якую ўшаноўваюць ва ўсім праваслаўным свеце і якая асабліва ахоўвае Белую Русь. Само аднаўленне Крыжа Прападобнай Еўфрасінні Полацкай, пачатае пяць гадоў таму назад, стала справай сапраўды ўсенародnай. У ім — наша пакаянне, наша вера, надзея і любоў да Бога і Айчыны.

Удзельнікі пасяджэння з задавальненнем адзначылі, што вельмі складаная ў навуковым, тэхнічным і духоўным плане работа па аднаўленню старажытнага крыжа паспяхова завершана брэсцкім майстрам Мікалаем Кузьмічом. Святыня, як і яе арыгінал, зроблены па благаславенні Прападобнай ігуменні Еўфрасінні майстрам Ларазам Богшам, таксама выканана ў тэхніцы візантыйскай перагародкавай эмалі і захоўвае ў сабе часцінкі крыжа Хрыстовай, каменя ад Гроба Гасподня, каменя ад Гроба Прасвятой Багародзіцы, Слаўнага і Жыватворчага Крыжа, святых мошчаў архідыякана першамучаніка Сцяфана, вялікамучаніка Дзімітрыя Салунскага і цаліцелі Панцеляймона.

Да 26 верасня крыж будзе знаходзіцца ў Мінску, а затым яго адправяць у Полацк, у Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, які з'яўляецца духоўным цэнтрам Беларусі, як і ў часы яго прападобнай заснавальніцы. 27 верасня вернутая святыня будзе ўрачыста абнавравана.

Валянціна МЕНШЫКАВА.

Актуальна

Малыя рэкі ствараюць вялікія праблемы экалагам

У межах водаахоўных зон малых рэк Смалявіцкага раёна выяўлена 60 аб'ектаў, у тым ліку ферм, механізаваных майстэрняў, складоў мінеральных угнаенняў і ядахімікатаў, што забруджваюць навакольнае асяроддзе.

Гэтыя факты прыводзіліся на пасяджэнні калегіі Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Начальнік аддзела па ахове водных рэсурсаў Уладзімір Зверач адзначыў, што мерапрыемствы, распрацаваныя па ахове прыбярэжных палос малых рэк, у Смалявіцкім раёне выкананы: пабудавана 17 гнаясховішчаў, перанесены за межы водаахоўнай зоны 4 жывёлагадоўчыя фермы, 9 летніх лагераў для выпасу жывёлы, 7 складоў ядахімікатаў і мінеральных угнаенняў.

Разам з тым, на думку Уладзіміра Зверава, у трох пасёлках для перасяленцаў з чарнобыльскай зоны, размешчаных у Смалявіцкім раёне, неабходна тэрмінова пабудаваць каналізацыйныя калектары.

У пастанове калегіі гаворыцца аб неабходнасці распрацаваць у наступным годзе праект водаахоўных зон і прыбярэжных палос Дуброўскага і Пятровіцкага водасховішчаў.

Аксана АСПІШЧАВА.

Супрацоўніцтва

У абнаўленні беларускага аўтамабільнага завода прыме ўдзел чэшскі экспартны банк

Перагаворы аб выдзяленні Чэшскім экспартным банкам крэдыту ў памеры 119 мільёнаў долараў ЗША на рэканструкцыю і мадэрнізацыю Беларускага аўтамабільнага завода прайшлі 23 верасня ў горадзе Брно.

У ходзе перагавораў былі вызначаны адказныя выканаўцы і тэрміны паэтапных работ. Фінансаванне праекта плануецца пачаць са студзеня наступнага года.

Як стала вядома БелТА, пасол Беларусі ў Чэхіі Уладзімір Бельскі мяркуе, што з падпісаннем Пратакола аб сумесным супрацоўніцтве вырашаны прынцыповыя пытанні адкрыцця крэдытнай лініі для абнаўлення адпаго з флагманаў машынабудаўнічай галіны нашай краіны.

Тэрэза ХАЮЦІНА.

Удакладнім...

Навошта мне прыпісваць чужыя палітычныя погляды? І нават пасады...

Паважаны галоўны рэдактар "Народнай волі"!

У артыкуле "Энцыклапедычная "Памяць" без... гістарычнай памяці і гістарычнай праўды?" ("Н.В.", 12.09.1997 г.) яе аўтар Алесь Мікалайчанка дапусціў крыўдную памылку. Ён, хутчэй за ўсё, пераблытаў прозвішча Петрашкевіч з прозвішчам Петрыкаў (такое ўжо здаралася) і "залічыў" мяне ў кіраўнікі выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя". Сапраўды, я шмат гадоў быў адным з кіраўнікоў названага выдавецтва, але толькі да 1991 года. І ўжо з гэтай прычыны, вядома ж, не мог у 1997 годзе разам з сённяшнім галоўным рэдактарам БелЭН Генадзем Пашковым падбіраць для выдавецтва функцыянераў "партыйна-наменклатурнага ўзору" з Барысава, як піша А.Мікалайчанка. У 1968—1970 гадах я сапраўды падбіраў энтузіястаў экцыклапедычнай справы — дарэчы, А.Мікалайчанка пра іх згадвае як пра энтузіястаў добрых — і шукаў іх разам з Петрусём Броўкам не ў Барысаве, а ў сталіцы. І тыя энтузіясты за чвэрць веку зрабілі ўсе асноўныя беларускія энцыклапедыі, якімі сёння ганарыцца нацыя. Бог мілаваў іх ад вельмі сур'ёзных заўваг па якасці амаль дзвюх соцень кніжак.

І яшчэ. Не варта было Алесю Мікалайчанку, наблытаўшы ў прозвішчах, прыпісваць мне чужыя "палітычныя погляды". У мяне ёсць свае. Яны звычайныя гістарычныя погляды на гісторыю і ніякія больш.

А па-другое (а яно больш важнае за першае), я сапраўды маю адносіны да стварэння і выдання 140-томнай Хронікі Памяці, але не як супрацоўнік выдавецтва БелЭН, а як кіраўнік арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных хронік пры Дзяржкамітэце па друку. У гэтым цэнтры працуюць сумленныя, нікім не ангажыраваныя прафесійныя гісторыкі, спецыялісты па крыніцазнаўству, бібліяграфіі і музейнай справе. У іх ліку доктар і тры кандыдаты гістарычных навук, а таксама два прафесійныя пісьменнікі. Імі праэцэнзаваны, дапрацаваны і рэкамендаваны для выдання больш за 70 рукапісаў Хронік Памяці, з якіх 34 ужо выйшлі ў свет і добра сустрэты чытачамі, асабліва настаўнікамі і моладдзю.

Няўдача з Барысаўскай хронікай першая, але не выпадковая. А справа ў тым, што недасканалы барысаўскі рукапіс наш цэнтр двойчы вяртаў барысаўскім аўтарам на дапрацоўку, і яны тое-сёе ў ім прычасалі-прыгладзілі. Тое-сёе, ды далёка не ўсё, што трэба было сур'ёзна правіць і грунтоўна дапрацоўваць, бо гісторыя Барысаўшчыны надзвычай багатая. І калі рукапіс за трэшіп разам не быў рэкамендаваны да выдання, ягоная ўкладальніца грымнула нашымі дзвярыма і занесла "неданоска" ў выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя". Там, відаць, палічылі, што яны самі з вусамі і, адмучаўшыся над рукапісам-паўфабрыкатам, выпусцілі ў свет вельмі тоўстую, дарагую, але недасканалую кнігу. Я асабіста вельмі шкадую, што прозвішчы супрацоўнікаў нашага арганізацыйна-метадычнага цэнтра акказаліся на яе тытуле.

І апошняе. Калі сёння 10 выдавецтваў, якія працуюць над хронікамі, з удзячнасцю карыстаюцца прафесійнай дапамогай арганізацыйна-метадычнага цэнтра, то выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" вуснамі намесніцы галоўнага рэдактара апошнім часам, але да выступлення Вашай газеты, заявіла, што яе выдавецтва і надалей абыдзецца без дапамогі цэнтра. Гэта сведчыць толькі пра тое, што "барысаўскі канфуз" можа паўтарыцца і яшчэ з некалькімі хронікамі, рукапісы якіх выдавецтва БелЭН прыдбала ў раёнах у абыход арганізацыйна-метадычнага цэнтра і запусціла ў набор без рэцэнзій, дапрацоўкі і рэкамендацый да выдання.

Будзем спадзявацца, што пасля артыкула Алеся Мікалайчанкі і майго тлумачэння выключэнняў з прынятага і зацверджанага правіла праходжання рукапісаў такога сур'ёзнага выдання, якім з'яўляецца шматтомная Хроніка Памяці, выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" мець не будзе.

Спадзяюся, што гэта маё пісьмо будзе надрукавана ў "Народнай волі", а мне будзе прынесена афіцыйнае прабачэнне за прыпіску чужых пасад і чужых палітычных поглядаў.

З павагай —

Алесь ПЕТРАШКЕВІЧ.

Ад аўтара артыкула "Энцыклапедычная "Памяць" без... гістарычнай памяці і гістарычнай праўды?"

Паважаны Аляксандр Лявонавіч!

Пакорліва прашу прабачэння. Сапраўды, згадваючы Ваша прозвішча, я дапусціў чыста асацыятыўную памылку. Вялікі дзякуй за справядлівую заўвагу, за навуку. Вельмі шкадую, што міжвольна прынёс Вам непрыемнасці.

З павагай —

прыхільнік Вашай творчасці журналіст Алесь МІКАЛАЙЧАНКА.

Ад рэдакцыі "Народнай волі"

Шаноўны Аляксандр Лявонавіч!

Спадзяёмся, Вы як творчы чалавек разумееце, што рэдакцыя не хацела Вас пакрыўдзіць. Так атрымалася... Просім прабачэння.

Кніжны і бронзавы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.)

— Чаму ж гэта? — пытаюся.

— Мала бацька папругі даваў, — адказаў ён.

Сам жа дзед Талаш яшчэ пры цяжэйшым часе пры прыгоне (нарадзіўся ў 1844 годзе) змог набыць пачатковую адукацыю. Іншы раз прасілі Дзмітрыя Васільевіча пакінуць у памятнай кнізе "след". Ад яго імя пісаў я. Унізе марудна старанна выводзіў сваё прозвішча шаноўны госць.

Запомнілася сустрэча ў Белдзяржуніверсітэце. Актавая зала факультэта філалогіі была паўнюткая. Загадчык кафедры беларускай літаратуры Вольга Казлова задала ў канцы некалькі пытанняў:

— Дзядзька Змітрок, мы добра ведаем пра дзеда Талаша. І Вы хораша расказалі. Але ж хочацца пачуць колькі слоў і пра Вашу маці.

Як заўсёды, быў лаканічным і прастадушным адказ:

— Памерла маці ў 1920 годзе. Бацька ды кажа: "Без гаспадыні нам цяжка, мужчынам. Нехта з нас, сынок, павінен ажаніцца — або ты, або я". Падумаў я і вырашыў: "Лепей я". Так і жыў ён са мной да самых немцаў.

— А ці дапамагаў вам чым-небудзь Колас як сваім героям?

— Калі ў 46-ым годзе мая дачка паступала ў медыцынскі інстытут, ён памог паступіць.

У зале ажыўленне...

— Ці не так сказаў? — збянтэжана звярнуўся да мяне Змітрок.

— Так, так, — падтрымліваю свайго "генерала". — І тут сядзяць такія.

Асабліва цёпла прайшоў вечар у педагагічным інстытуце імя Горкага. Атмасферу таварыскасці міла падтрымліваў "тамада" прафесар Антон Семяновіч. Сустрэча вылілася ў шчырую гаворку пра твор і яго герояў. Пасля вечара ўсе разыходзіліся ўзбуджаныя, задаволеныя. Дзіва што — жывога Панаса з "Дрыгвы" пабачылі. Шмат было ў той час розных сустрэч...

Дзівіўся сталічны госць, чаго і куды спяшаюцца людзі ў гэтым Мінску. Задумваўся яшчэ і над іншым. Едзем мы на аўтазавод. Дарога доўгая. Дзядзька Змітрок сядзіць, а я стаю каля яго. Праходзіць пэўны час, і ён:

— Ай-я-яй! Гэта ж столькі можна было б пасадзіць бульбы, колькі гэты Мінск займае! — цяжка ўздыхнуў ён.

Павёў Панаса паглядзець помнік Якубу Коласу, а, значыць, і яму з бацькам. Заадно захацеў і сфатаграфаваць яго каля манумента. Уважліва разглядаў усе фігуры. Як вядома, дзеда Талаша ляпіў З.Азгур з натуры яшчэ ў час вайны. Панаса ж — адвольна 18-гадовым юнаком. Ніякага фота гэтага ўзросту Змітрака не захавалася. Дый, пэўна не было яго зусім.

Яшчэ не мог уцяміць:

— Слухай, чаму Колас мяне перайменаваў? Хіба Змітрок горш за Панаса?

На сустрэчах заўсёды былі сардэчнасць, паяднанне з публікай. І, вядома ж, кветкі, сувеніры... Зацікавіў госця дарунак, паднесены работнікамі Фундаментальнай бібліятэкі імя Я.Коласа АН Беларусі. Гэта шкатулка "Дзед Талаш". Уладальнік паглядзеў, памацаў і заўважыў:

— Во куды залез мой бацька!

У чыгуначным вучылішчы падарылі разьбу па дрэве. Ну вылітая шакаладка! Праўда, у вельмі павялічаным памеры. Усміхнуўся Дзмітрый Васільевіч:

— Нам з маладзіцай хопіць на добры месяц.

Павёз я свайго "генерала" на вакзал для адпраўкі на радзіму. Звяртаюся да мужчыны, што суполіў з дзядзькам Змітраком у адным пакоі:

— Вы ведаеце, з кім жылі?

— Не.

— Гэта ж сын легендарнага беларускага партызана дзеда Талаша!

Здзіўленне і ўздых. Выходзім на вуліцу.

— Дзмітрый Васільевіч, а ён не пытаўся ў Вас, хто Вы такі?

— Пытаўся.

— А Вы не прызналіся?

— Не. Маладзіца мне сказала: "Не кажы, што ты Талаш. Возьмуць і заб'юць".

Тройчы прыязджаў па майму выкліку ў Мінск Панас (Змітрок) — у 1974, 1975, 1977 гадах. Апошнім разам выступаў і па тэлебачанні. Правёў я яго. А неўзабаве — тэлеграма: "Памёр Дзмітрый Талаш". Нікому з музейцаў, нават і мне, паехаць не давялося на пахаванне. Пішу пісьмо жонцы. Прыходзіць адказ — палез на печ, каб трошкі па-сялянску адпачыць. Заснуў і... не прачнуўся. Было гэта 27 снежня 1977 года. 27 верасня таго ж года яму споўнілася 75. Не дажыў да ўзросту бацькі 27 гадоў. Дзед Талаш, як вядома, памёр на 103-ім годзе жыцця ў 46-ым.

Іван КУРБЕКА, пісьменнік, старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Здарэнні

Укралі машыну ад... офіса ДАІ

Не паспелі работнікі Нацыянальнага алімпійскага камітэта рэспублікі нарадавацца, гледзячы на аўтамабіль "Аўдзі-80", перададзены ім пасля канфіскацыі на мытні, як яго і след прастыў. А здарылася проста-такі цікавая гісторыя.

Кіраўнік спраў НАКа паехаў на гэтай машыне ў рабочую ДАІ, каб афармiць на яе неабходныя дакументы. Прыпаркаваўшы "Аўдзі-80" у вызначаным месцы, сам пайшоў у кабінет да службовай асобы. Усяго паўгадзіны прабыў ён там, але гэтага хапіла, каб машына знікла ў невядомым напрамку. Работнікі

Народная Воля 27 ВЕРАСНЯ 1997 г.

27 верасня — 4 кастрычніка

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

■ ВЫСТАВЫ

Нацыянальны мастацкі музей прапануе пазнаёміцца з экспазіцыяй твораў Івана Айвазоўскага з фондаў музея. Таксама тут працуе экспазіцыя мастакоў суполкі "Віцебская акварэль".

У Палацы мастацтваў — *да 28 верасня* працуе выстава мастачкі Алы Замай. Таксама тут можна пабачыць экспазіцыю Беларускай акадэміі мастацтваў і выставу, прысвечаную памяці знакамітага беларускага мастака Альгерда Малішэўскага.

У Нацыянальным музеі гісторыі Беларусі можна пабачыць выставу "Ля вытокаў беларускай археалогіі" і даведацца пра цяжкі лёс беларускіх археолагаў, рэпрэсіраваных у 1937 годзе, пазнаёміцца з іхнімі працамі. Па заканчэнні выставы плануецца правесці навуковы семінар, дзе адбудзецца выніковая гутарка пра ролю выставы ў культурных стасунках паміж Польшчай і Беларуссю. Таксама тут працуе экспазіцыя "Старажытная беларуская геральдыка".

Па-ранейшаму ў музеі можна акунуцца ў свет "Казачных фантазій".

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае наведаць экспазіцыю, якая распавядае пра трагедыю беларускага народа ў перыяд фашысцкай акупацыі. Наведвальнікаў музея чакаюць дзве выставы: "Радавыя Перамогі" і "Светлая памяць". Першая прысвечана ваенным лёсам простых салдат, а другая экспануе творы выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Яшчэ ў музеі пачала працаваць экспазіцыя "Першыя ўзнагароды Вялікай Айчыннай вайны", прымеркаваная да 50-годдзя з дня заснавання першых медалёў і ордэнаў.

У Літаратурным музеі Янкі Купалы праходзіць літаратурная тэматычная вечарына "Беларусы ў Вільні", а таксама будуць падведзены вынікі Міжнароднага купалаўскага пленэру, што адбыўся сёлета ў маі — ліпені.

Музей гісторыі беларускай літаратуры зараз рыхтуе выставу, прысвечаную творчай дзейнасці Пімена Панчанкі. Пра час адкрыцця экспазіцыі наша газета паведаміць у наступных нумарах.

У мастацкай галерэі "Жыльбель" *(вул. Багдановіча, 9а)* праходзіць выстава экзатычных жывёл. Наведвальнікі выставы змогуць пазнаёміцца з суслікамі, рыссю, малпачкамі, чарапахамі Матамата, змеямі і іншымі экзатычнымі звярамі.

Галерэя "Мастацтва" *(пр-т Ф.Скарыны, 12) да 2 кастрычніка* запрашае пазнаёміцца з творамі Віктара Каралёва. З *3 кастрычніка* тут пачне працаваць выстава твораў Фелікса Янушкевіча.

Музей валуноў *(мікрараён Уручча-2)* запрашае на экскурсію па валунах, сабраных з усёй тэрыторыі рэспублікі.

Галерэя "Верхні горад" *(пл. Свабоды, 5)* запрашае пазнаёміцца з творамі беларускіх мастакоў: Алега Скавародкі (Віцебск), Ігара Рымашэўскага, Леаніда Шчамялёва, Мікалая Бушчыка, Яны Первяковай, Дзмітрыя Маслея, Дзмітрыя Зяньковіча, Ніны Голышавай, Эдуарда Багранцава, Валянціна Губарава і іншых. Таксама тут можна наведаць экспазіцыю мастака Алеся Сушы.

У Палацы культуры Мінскага трактарнага завода кожную нядзелю праходзіць кніжная выстава-кірмаш.

У Рэспубліканскім Доме тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнцкай моладзі *(вул. Славінскага, 12)* экспануецца больш за дзве тысячы твораў тэхнічнай і мастацкай творчасці беларускіх юнакоў і дзяўчат.

У музеі прыроды і экалогіі *(вул. К.Маркса, 12) — да 1 кастрычніка* будзе працаваць даволі экзатычная экспазіцыя "Чароўны свет матылькоў", дзе прадстаўлены дзённыя і начныя матылькі Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі.

У ВАЛОЖЫНЕ

Краязнаўчы музей запрашае пазнаёміцца з выставай "Птушкі Налібоцкага краю", падрыхтаванай з фондаў сталічнага музея прыроды і экалогіі.

У музеі сучаснай беларускай скульптуры імя Андрэя Бэмбеля экспануецца выстава твораў скульптара Анатоля Бачкарова (1942—1997).

■ КАНЦЭРТЫ

Сталічны цырк запрашае на адкрыццё сезона. У новай праграме "Усё гэта — цырк!" упершыню прымаюць удзел артысты беларускага і маскоўскага цыркаў.

У Палацы культуры чыгуначнікаў

4—5 верасня — пройдуць гульні Вышэйшай лігі Беларускага клуба вясёлых і знаходлівых.

У зале камернай музыкі Белдзяржфілармоніі *(пр-т Ф.Скарыны, 44а)*

30 верасня — музыка Амерыкі ў выкананні мінскага брас-квінтэта (мастацкі кіраўнік — В.Волкаў, музыказнаўца — В.Савіцкая). У праграме — Гершвін, Джоплін, Соуза, Хандзі, Герман, Элінгтон.

■ ТЭАТРЫ

Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы

27 верасня — П.Чайкоўскі "Іаланта", опера ў адной дзеі.

28 верасня — **ПРЭМ'ЕРА!** Дж.Вердзі "Травіята", опера ў чатырох дзеях.

30 верасня — У.Солтан "Дзікае паляванне караля Стаха", опера ў дзвюх дзеях.

2 кастрычніка — П.Чайкоўскі "Пікавая дама", опера ў чатырох дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр балета

28 верасня — К.Хачатуран "Чыполлино", балет у трох дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

27 верасня — Я.Купала "Паўлінка". На Малой сцэне — "Смех лангусты".

28 верасня — "Паўлінка", "Касцюмер".

29 верасня — "Ажаніцца — не журыцца".

1—3 кастрычніка — "Умовы дыктуе жанчына".

4 кастрычніка — "Паўлінка", "Лес". На Малой сцэне — "Смех лангусты".

Мінскі тэатр сатыры і гумару "Хрыстафор"

27 верасня — "Хорошо сидим!", эстраднае прадстаўленне.

28 верасня — "М" і "Ж", спецыяльны выпуск для мужчын і жанчын.

У Дзяржаўным тэатры музыкі медыі

27 верасня — О.Штраус "Шляпа Наполеона".

Тэатр-лабараторыя "Вольная сцэна"

27, 28 верасня — "Барбара Радзівіл", гістарычная драма.

Падрыхтавала Марына КОКТЫШ.

Хочаце — верце, хочаце — не верце

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

Авенам (21 сакавіка — 20 красавіка) — плённую працу, тугу і рамантыку. Па ўсёй верагоднасці, вашыя творчыя задумы і напрацоўкі могуць быць палічаныя альбо занадта незразумелымі з прычыны ігнаравання традыцыйных рэчаў, альбо занадта простымі з прычыны празмернага адкату да іх. Планеты раяць вам імкнуцца адшукаць "залатую сярэдзіну", сінтэзаваўшы ў сваіх творах і тое, і другое. Гэты тыдзень — самы час закончыць справы з выплатай падаткаў і іншым фінансавым тлумам. Занятак гэтымі справамі, як сцвярджаюць астролагі, не перашкодзіць рамантычным прыгодам, новым знаёмствам і набыццю сяброў.

Цяльцам (21 красавіка — 21 мая) — здзяйсненне планаў, звязаных з падарожжам. Не выключана, што перагляду на гэтым тыдні запатрабуюць некаторыя вашыя творчыя задумы і ініцыятывы. Але, па словах астролага, гэта зусім не азначае, што з імі трэба развітацца. Проста неабходна падумаць пра тое, як зрабіць іх максімальна зразумелымі для тых, хто вакол вас. У сярэдзіне тыдня планеты раяць вам быць больш сабранымі, чым звычайна. Абыходзьце бокам усялякія інтрыгі сярод калег. Дарэчы, любыя вашыя справы на гэтым тыдні акажуцца паспяховымі. Не будзе таксама і перашкод для рамантычных прыгод і знаёмстваў.

Блізнятам (22 мая — 21 чэрвеня) — фінансавыя аперацыі. Планеты не раяць вам спяшацца з дзеяннямі напачатку і напрыканцы тыдня. У першай палове тыдня зоркі раяць вам добра паразважаць пра ўзровень свайго майстэрства. Правільна прынятае рашэнне адносна ўласнага прафесіяналізму, верагодна, дазволіць вам у гэты час шмат чаго змяніць. У сярэдзіне тыдня скрупулёзна ўдакладняйце ўсялякія абавязацельствы, якія вы бераце на сябе альбо ўскладаеце на іншых. Верагодныя таксама як падман, так і самападман, што, дарэчы, значна больш непрыемна.

Ракам (22 чэрвеня — 23 ліпеня) — прафесійныя праблемы і пацалункі. Вам, як нікому іншаму, сцвярджаюць планеты, давядзецца ўважліва сачыць за ўсім, што будзе напісана, вымаўлена і пачута на гэтым тыдні. Не забывайце, што ўдала падабранае слова і ініцыятывы ў кантактах могуць стаць гарантам поспеху ў рэалізацыі вашых творчых задум у першай палове тыдня. Калі, безумоўна, слова знойдзеце, а перспектыўнасць кантактаў здолееце разгледзець. Але ў той жа час памятайце: адно няправільнае слова — і вамі будуць не вельмі задаволеныя на самым версе.

Львам (24 ліпеня — 23 жніўня) — спонсарскую дапамогу. Магчыма, перспектывы матэрыяльнага дабрабыту, а таксама няпоўная ўпэўненасць ва ўласных творчых здольнасцях і магчымасцях могуць стаць вашым "галаўным болем" на гэтым тыдні. У сярэдзіне тыдня планеты раяць вам выказваща больш гранічна, дакладна і зразумела. Праўда, спробы красамоўства і філасофствавання могуць завесці ў тупік у першую чаргу вас самых.

Дзевам (24 жніўня — 23 верасня) — камерцыйныя аперацыі. Не выключана, што на гэтым тыдні вам давядзецца прагледзець сваё ўменне знаходзіць кампрамісы і цывілізавана адстойваць свае аўтарскія правы. Праца над уласнымі ідэаламі і ўчынкамі, што робяцца, па ўсёй верагоднасці, згодна з вашымі маральна-этычнымі прынцыпамі, дазволіць не памыліцца пры прыняцці рашэнняў у першай палове тыдня. У яго сярэдзіне астролаг раіць засцерагацца што-небудзь радыкальна мяняць, асабліва калі раптам падасца, што вы можаце дамагчыся, дзякуючы гэтаму, большай паўнаты і гармоніі. Усё гэта, на жаль, можа аказацца банальнай ілюзіяй.

Шалям (24 верасня — 23 кастрычніка) — летуценні. Верагодна, на гэтым тыдні паўстане перад вамі праблема перамен, прычым не столькі саміх зменаў у розных аспектах вашай творчасці, колькі даверу да плыні жыцця і прынята ягоных шматлікіх сюрпрызаў без залішніх разваг і спробаў іх ацаніць. У першай палове тыдня здольнасць "трымаць нос па ветры" дазволіць замацаваць сваю папулярнасць. У сярэдзіне тыдня супрацьпаказаныя далёкія падарожжы, а таксама дыскусіі і балбатня на рэлігійна-філасофскую і маральную тэматыку.

Скарпіёнам (24 кастрычніка — 22 лістапада) — тэлефонныя размовы. Як сцвярджаюць астролагі, на гэтым тыдні для вас катэгарычна непажаданыя паездкі за мяжу. На працягу тыдня таксама паўстане пытанне пра ўплыў каштоўнасцяў на вашыя перакананні, жыццёвую філасофію і ідэалы. Верагодна, што рэалізацыя некаторых уласных даўніх задум і плённыя стасункі з калегамі дазволяць лёгка прагледзець штосьці з вышэйзгаданага. У аўторак — чацвер планеты раяць вам устрымацца ад дэманстрацыі сваіх эгаалій — такія акцыі могуць быць няправільна патлумачаныя вашым атачэннем.

Стральцам (23 лістапада — 21 снежня) — нечаканыя прапановы. На гэтым тыдні вам нарэшце прыйдзецца дакладна разабрацца з праблемамі ўласнага прэстыжу, папулярнасці і месца, якое вы займаеце ў грамадстве. Ад таго, наколькі шчыра вы прааналізуеце свае прэтэнзіі на самасвядомасць, могуць залежаць вынікі будучых памкненняў. У сярэдзіне тыдня, не выключана, вам прыйдзецца кардынальна заняцца сваім здароўем. Родныя і блізкія могуць прынесці вам шмат радасці, якой прыбавіцца ад атрымання даўно чаканай сумы і поспехаў у бізнесе.

Казярогам (22 снежня — 20 студзеня) — сяброўскія парады. Не выключана, што вам прыйдзецца, як ніколі, папакутаваць над сваім іміджам. Планеты раяць вам прыслухацца да парадаў знаёмых: верагодна, іхнія веды будуць для вас даволі карыснымі і дасціпнымі. А вось напрыканцы тыдня здолейце самі правільна ацаніць уласныя патрэбы і магчымасці іх задаволіць. Гэтая працэдура, верагодна, дазволіць вам правільна разлічыць сілы, пазбегнуць знясіленасці ў выніку карпатлівай працы і, як наступства, захаваць бадзёры знешні выгляд. Палітыкам на гэтым тыдні зоркі раяць як мага менш ілгаць — гэта ўвогуле дрэнна, а ў бліжэйшыя дні можа нават прывесці да катастрафічных вынікаў.

Вадалеям (21 студзеня — 19 лютага) — гармонія і весялосць. Хутчэй за ўсё, вам давядзецца глыбей, чым гэта было раней, прэпараваць глыбіні ўласнай душы. Ад таго, наколькі самастойна і шчыра гэта будзе зроблена, залежаць матывы далейшых творчых пошукаў і даследаванняў. У першай палове тыдня ўменне зрабіць выбар, не дэманструючы яго астатнім, дазволіць набыць вялікую ўпэўненасць ва ўласных творчых магчымасцях і захаваць сілы, якія для вас цяпер зусім не залішнія. У фінансавых пытаннях не зганяйцеся ні на якія нерэальныя праекты. Не давайце таксама сабе паслабленняў і ў асабістым жыцці: захоўвайце амаль воінскую дысцыпліну.

Рыбам (20 лютага — 20 сакавіка) — добры настрой. Верагодна, вам давядзецца зрабіць дакладны аналіз уласных доўгатэрміновых творчых планаў, праектаў і стасункаў з калегамі. На пачатку тыдня ваша актыўнасць можа стаць нагодай для шматабяцальнага знаёмства альбо далучэння да перспектыўнай і, магчыма, удалай задумы. У сярэдзіне тыдня планеты раяць вам засцерагацца задавальняць свае патаемныя страсці. Яны здольныя стварыць спрыяльныя ўмовы для нядобразычліўцаў. Імкніцеся лепш за ўсё дзейнічаць сумленна і адкрыта.

Дзень у гісторыі

27 верасня

У 1605 г. адбылася Кірхгольмская бітва, у якой 4-тысячнае польскае і літоўска-беларускае войска на чале з Янам К.Хадкевічам разбіла 14-тысячнае войска шведаў.

У 1904 г. нарадзілася Вера Харужая, беларуская падпольшчыца, публіцыстка, аўтарка дакументальнай кнігі "Лісты на волю" (1931 г.).

У 1942 г. у Маскве адбыўся II антыфашысцкі мітынг прадстаўнікоў беларускага народа.

У 1965 г. пачалася Дэкада беларускай культуры ў Балгарыі.

28 верасня

У 1759 г., у час Сямігадовай вайны, руская армія на чале з П.С.Салтыковым увайшла ў Берлін. Пасля капітуляцыі горад быў аддадзены на рабаванне і абавязаўся выплаціць пераможцам 1,5 млн. талераў.

У 1897 г. нарадзіўся М.А.Ауэзаў, казахскі пісьменнік, вучоны, які паклаў пачатак абаязнаўству, а таксама напісаў кнігу па Ідыю.

У 1942 г. адбыўся Ушацкі бой паміж партызанскімі брыгадамі і нямецка-фашысцкім гарнізонам. У выніку яго г.п.Ушачы былі заняты партызанамі.

У 1967 г. прайшоў Дзень Беларусі на Сусветнай выстаўцы "Экспа-67" у Манрэалі (Канада). У гэтай краіне пражывае шмат беларусаў-эмігрантаў, іх дзяцей і ўнукаў (ужо амерыканцаў беларускага паходжання).

У 1989 г. аднавіла сваю дзейнасць Мінская праваслаўная духоўная семінарыя (в.Жыровічы, Слонімскі раён). Яна была заснавана ў 1793 г.

29 верасня

У 1823 г. нарадзіўся Уладзіслаў Сыракомля (сапраўднае імя Людвіг Кандратовіч), польскі і беларускі паэт, які стварыў у паэзіі новы жанр — вершаваную гутарку (напрыклад, твор "Паштальён", які стаў пасля перакладу і ў скарочаным выглядзе рускай народнай песняй "Ямшик").

У 1935 г. у сталіцы і іншых гарадах СССР была скасавана спажывецкая кааперацыя і пакінуты толькі дзяржаўныя магазіны.

У 1937 г. у Мінску адкрыты першы на Беларусі Палац піянераў і школьнікаў.

У 1941 г. нямецкая зондэркаманда знішчыла 33 тысячы яўрэяў у мястэчку Бабін Яр пад Кіевам.

У 1972 г. паміж СССР і Рэспублікай Мадагаскар устаноўлены дыпламатычныя зносіны. "Час робіцца вечнасцю, імгненне — гаворкай..." (Рабеманандзара, мадагаскарскі паэт, нібыта пра дзень у гісторыі).

Зміцер ВІШНЁЎ.

Спорт

■ *Хоккей*

Чешский нападающий Яромир Ярг подписал новый 7-летний контракт с клубом НХЛ "Питсбург Пингвинз" на сумму 49 млн. долларов.

■ *Легкая атлетика*

На прошедшем в Джакарте Международном турнире по легкой атлетике в ходьбе на 10 км первой финишировала белоруска Ольга Кардольцева.

■ *Футбол*

За три тура до финиша 6-й год подряд чемпионом Норвегии стал клуб "Русенборг". Это уже 12-й титул чемпиона этой норвежской команды.

* * *

В Египте завершился чемпионат мира среди юниоров (до 17 лет). В финале сборная Бразилии переиграла сборную Ганы со счетом 2:1, африканским футболистам даже не помогло удаление бразильского игрока.

В матче за 3-е место футболисты сборной Испании переиграли немцев — 2:1.

* * *

ФИФА обнародовал новый рейтинг-лист сборных команд мира. Сборная Беларуси в нем занимает 106-е место. А вот как выглядит первая двадцатка:

1. Бразилия. 2. Германия. 3. Румыния. 4. Голландия. 5. Дания. 6. Испания. 7. Англия. 8. Норвегия. 9. Колумбия. 10. Аргентина. 11. Мексика. 12. Италия. 13. Болгария. 14. Чехия. 15. Марокко. 16. Россия. 17. Франция. 18. Япония. 19. Замбия. 20. Тунис.

■ *Теннис*

В Токио завершился турнир на Кубок принцессы, в финале которого американка Моника Селеш обыграла испанку Аранто Санчес-Викарио (6:1, 3:6, 7:6).

Алексей ЖУРАВЕЛЬ.

Осенние заботы

Можно ли хранить яблоки в полиэтиленовых мешочках?

Яблоки сортов "Осеннее полосатое", "Анис серый", "Славянка", "Пепин шафранный" вполне можно хранить в полиэтиленовых мешках емкостью от 1 до 3 кг. Делают такие мешки из пленки толщиной от 30 до 60 микрон. Более толстая полиэтиленовая пленка не пригодна для изготовления мешков, так как помещенные в них плоды быстро портятся. Можно использовать для хранения яблок и тонкие полиэтиленовые пакеты, которые продаются в магазинах. Упаковывать плоды в такую тару нужно лишь спустя 10—12 дней после их сбора. Запаивать мешки не обязательно, а завязать необходимо. В полиэтиленовых мешках яблоки довольно долго остаются сочными и хрустящими, они редко загнивают и плесневеют — этому способствуют накопление углекислоты и снижение в мешках содержания кислорода в результате "дыхания" плодов.

Посадили смородину. Кустики небольшие, слабенькие. Обрезать их или нет?

Обрезать посаженные растения смородины необходимо. При их обрезке укорачивают каждое разветвление, оставляя от 2 до 4 сильных почек. Чем слабее был прирост побегов саженца, тем сильнее нужно его укорачивать. Укорачивание усиливает ветвление, способствует отрастанию из подземных почек сильных побегов и ускоряет формирование куста.

Как долго ядохимикаты сохраняют свои свойства?

После длительного хранения многие ядохимикаты портятся и становятся недостаточно токсичными для вредителей. У многих из них повышается фитонцидность — способность обжигать листья и кору растений. При хранении в неповрежденных упаковках в сухих помещениях большинство ядохимикатов сохраняет свои свойства не более 1,5—2 лет.

Деликатные проблемы мужчин

Сексуальность — неотъемлемая черта личности человека. Поэтому и неудивительно, что желание ощутить полную гамму переживаний, чувств человек стремится сохранить как можно дольше. Понятно, что сексуальные проявления у мужчин в 20—35 лет и в более старшем возрасте не одинаковы. Если в молодости преобладает физическое влечение, то с годами на первое место выходит духовное, моральное начало, другие формы общения, которые по красоте и богатству порой не уступают физическим взаимоотношениям. Ведь еще великий Фрейд сказал: "Было бы большой ошибкой считать, что большинство мужчин связывают собственную сексуальность только с эрекцией полового члена". На сексуальность нельзя смотреть однозначно. Часто сексуальность мужчины напрямую связана с сексуальностью женщины. Лишь при взаимопонимании партнеров возможны полноценные половые отношения. Один из аспектов, который снижает сексуальность, — это стереотип, привычка. Новые штрихи в поведении, новые чувства помогают поддерживать влечение друг к другу. Значительно снижает потенцию и употребление алкоголя, курение. Несмотря на то, что алкоголь в крови находится сравнительно недолго, его окисленные продукты (метаболиты) задерживаются в мозгу, печени, сердце, нервной системе, других органах до 15 суток. Мужскую силу значительно снижает избыточный вес. Жиры, холестерин оккупируют кровеносные сосуды, создавая преграду нормальному кровенаполнению всех органов, в том числе и половых. Издавна в народе для поддержания хорошего самочувствия, сексуального здоровья пили различные чаи, настойки из лечебных трав, то есть стремились повысить потенцию природными средствами. Не отказываются от них и сегодня — не только у нас, но и на Западе. В числе таких натуральных средств, возвращающих мужчине юношескую полноту чувств и возможностей, биологически активная пищевая добавка **"Супер-Йохимбе Экстракт"** производства Национальной академии питания США. Воздействуя на мужской организм, **"Супер-Йохимбе Экстракт"** заставляет его вырабатывать собственный тестостерон — мужской половой гормон. Известно, что высокий уровень тестостерона омолаживает организм и оказывает непосредственное влияние на потребность в сексе. Кроме того, этот препарат помогает от простатита, полового бессилия, способствует появлению оптимизма, повышению активности.

Сергей КУРСКИЙ.

Получить бесплатную консультацию сертифицированных специалистов и приобрести **"Супер-Йохимбе Экстракт"** Вы можете в **"Медицинском центре"** по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 75, корпус 1. Время работы: с 9.00 до 19.00, без выходных и перерыва.

Здесь также можно приобрести:

"Супер-Сжигатель жира №1" — натуральный продукт для избавления от лишнего веса и омолаживания организма без диет и физических нагрузок;

"Акулий хрящ" — противовоспалительный препарат (профилактика раковых заболеваний);

"Супер-Пчелиную пыльцу" — богатейший источник энергии и жизненных сил;

"Про-Мэн-Экстра" — биологически активную пищевую добавку, способствующую излечению мужчин от аденомы и воспалений предстательной железы;

"Супер-Голденсил" — очиститель организма от шлаков и токсинов;

"Супер-Биокомплекс" — стимулятор функциональных систем организма.

